PolotskSU



7. Акты литовской метрики (1499 – 1507). – Варшава, 1897. – Т. I. – 200, LV с.
8. Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства. – Москва. – 1892. – VIII, 884, C, VI с.
9. Документы Московскаго архива Министерства юстиции. – Москва, 1897. – Т. 1. – XXIII, 569 с.
10. Устава на Волоки и дополняющие её документы шестой книги Литовских публичных дел Метрики Литовской. Извлечено из XXX-го тома «Русской исторической библиотеки». – Юрьев: Археографическая комиссия, 1913. – 62 стб.
11. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 70 (1582 – 1585). Кніга запісаў 70 (Копія канца XVI ст.). – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 354 с.
12. Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная пинским старостою Станиславом Хвальчевским в 1552 – 1555 г. – Вильна, 1884. – XXXII, 714 с.
13. Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561-1566 годах Пинским и Кобринским старостой Лаврином Войною. – Вильна ,1874. – Ч.1. – X, VIII, 421 с.; Ч. 2. – XVI, 599, 140 с.
14. Мелешко, В.И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII – XVIII в.). – Минск: Наука и техника, 1975. – 248 с.
15. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов – Вильна, 1898. – Т. XXV. – XXXII, 614 с.
16. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. – Вильна, 1914. – Т. XXXVIII. – IX, 504 с.
17. Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. – Вильна, 1910. – Т. XXXV. – XXXII, 624 с.
18. Volumina Legum. Przedruk zbioru praw staraniem XX. pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. – Petersburg, 1859. – T. II. – 482, XIII s.
19. Ревизия Кобринской экономии, составленная в 1563 году королевским ревизором Дмитрием Сапегою. –Вильна, 1876. – XII, 387, 56 с.
20. Похилевич, Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. – Вильнюс, 1966. – 216 с.
21. Козловский П.Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. (центральная и западная зоны). – Минск: Наука и техника, 1974. – 181 с.
22. Военно-статистическое обозрение Российской империи. – Т. VIII, ч. 1. – Витебская губерния. СПб, 1852. – 267 с.

**TERRITORIAL SYSTEMS OF RURAL SETTLEMENTS OF BELARUS 16th – 19th CENTURIES**

S. MILUCHENKOV

*The territorial systems of rural settlements were a form of spatial union of groups of settlements in one structure in order to solve local economic problems. They had certain geographical boundaries and were under the administrative and economic management of landowners or other persons appointed to perform managerial functions. The main criterion for identifying the boundaries and structure of the territorial systems of rural settlements is the nature of the ties that have developed as a result of the division of land into property between the state and representatives of the privileged estate.*
***Key words:*** *types of land tenure, structure and names of estates*.

УДК 392.5+316.73(476.5)«199/20»

## АБ’ЕКТЫ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ ЯК СРОДАК ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СЯМЕЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВІЦЕБШЧЫНЫ)[1]

**Мішына В.І.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк

*У працы аналізуюцца аб’екты культурнага ландшафту як сродак папулярызацыі традыцыйных сямейных каштоўнасцей ва ўмовах крызісных з’яваў, характэрных для інстытутаў сям’і і шлюбу на сучасным этапе. На прыкладзе стварэння і выкарыстання архітэктурных і скульптурных форм, ландшафтных комплексаў праілюстраваны спосабы рэактуалізацыі сямейных каштоўнасцей у сучасным грамадстве.*
***Ключавыя словы:*** *культурны ландшафт, традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, сям’я, шлюб, вясельны абрад.*

**Уводзіны.** На сучасным этапе развіцця для беларускага грамадства ўласцівы крызісныя з’явы ў сферы сямейна-шлюбных адносін. Гэта ўвасабляецца не толькі ў паніжэнні дэмаграфічных паказчыкаў, але і ў змене каштоўнасных арыентацый і як вынік – у фарміраванні спецыфічных мадэляў дэмаграфічных і рэпрадуктыўных паводзін. У 2017 годзе ў Беларусі было праведзена маштабнае сацыялагічнае даследаванне “Фарміраванне сям’і, стабільнасць сямейных адносін і нараджальнасць у зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах жыцця беларусаў”. Яно ажыццяўлялася ў межах праекта “Падтрымка рэалізацыі Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь” і ўваходзіла ў міжнародную праграму “Пакаленне і гендэр”, мэта якой – “вывучэнне і аналіз дынамікі станаўлення і развіцця інстытуту сям’і і сямейных адносін у розных краінах свету, рэпрадуктыўнай арыентацыі і паводзін грамадзян, тэндэнцый нараджальнасці ў зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах і зменах грамадскіх каштоўнасцей” [1, с. 4]. На падставе аналізу дадзеных сацыялагічнага даследавання і пабудовы “ўзроставых мадэляў жыццёвых шляхоў для кагорт 1940-1989 гг. нар”. было выяўлена, што “больш маладыя кагорты дэманструюць тэндэнцыю да павелічэння часавага інтэрвалу паміж уступленнем у першы шлюб і і нараджэннем першынца ў параўнанні з кагортамі старэйшага ўзросту; са змяншэннем узросту абследуемай кагорты

[1] Работа выканана ў межах праекта БРФФД-РФФД «Субкультура дзяцінства ў дыскурсе вуснай гісторыі, мове і фальклоры Віцебска-Пскоўскага памежжа XX - пач. XXI ст.», 2020–2022 гг.", № Г20Р-095.

PolotskSU



павялічваецца тэндэнцыя да эмансіпацыі жанчын, што праяўляецца ў павелічэнні часавага інтэрвалу паміж сепарацыяй і ўступленнем у шлюб; іншымі словамі, досвед самастойнага жыцця жанчыны становіцца больш працяглым; жаночыя ўзроставыя кагорты выразна дзеляцца на 2 групы па дэмаграфічных паводзінах: для "авангарднай групы" 1940-1969 гг. нар. характэрна больш высокая верагоднасць зачацця ў першыя два гады знаходжання ў шлюбе, чым для "ар'егарднай групы" 1970-1989 г.нар., што дэманструе тэндэнцыю да "адкладвання зачацця" [2, с. 21]. Пра змены ў структуры сямейных каштоўнасцяў сведчыць і нетрываласць інстытуту шлюбу (паводле статыстычных дадзеных, у Беларусі ў апошнія гады суадносіны зарэгістраваных шлюбаў і разводаў блізкія да паказчыка 2:1) [3, с. 23], і даволі істотны працэнт фактычных шлюбаў без афіцыйнай рэгістрацыі, а таксама павелічэнне тэндэнцыі да адсутнасці шлюбнага партнёра ўвогуле. Так, па выніках названага даследавання аказалася, што толькі 61,6% рэспандэнтаў знаходзяцца ў афіцыйна зарэгістраваных шлюбах, астатнюю частку склалі рэспандэнты, якія пражываюць у незарэгістраваных шлюбах, LAT-саюзах[1] або не маюць шлюбнага партнёра ўвогуле [2, с. 22].

**Асноўная частка.** Відавочна, што названыя працэсы ствараюць пагрозы для дэмаграфічнай бяспекі краіны, таму на дзяржаўным узроўні прадпрымаюцца разнастайныя захады па пераадоленню негатыўных дэмаграфічных тэндэнцый. Апрача іншага, вялікае значэнне надаецца папулярызацыі сямейных каштоўнасцей, аб чым сведчыць змест Дзяржаўнай праграмы "Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь" на 2016-2020 гг., у прыватнасці, мерапрыемствы, прадугледжаныя Падпраграмай 1 "Сям'я і дзяцінства" (пп. 18-25 падпраграмы) [4].

У тым ліку, у дадзены працэс папулярызацыі сямейных каштоўнасцей актыўна ўключаюцца элементы культурнага ландшафту, як ужо існуючыя, так і наноў створаныя. Яскравым прыкладам таго можа служыць стварэнне культурна-ландшафтнага комплексу ў а/г. Сар'я Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл.

Свайго роду "стартавай кропкай" для стварэння названага комплексу стала Успенская царква, пабудаваная мясцовым землеўладальнікам Ігнаціем Лапацінскім у сярэдзіне ХІХ стагоддзя [5, с. 172-173]. Мэтам актуалізацыі сямейных каштоўнасцяў паслужыла, найперш, папулярызацыя гісторыі паўстання названай святыні, згодна якой, Лапацінскі пабудаваў храм у памяць аб сваёй дачасна памерлай жонцы, якую вельмі кахаў [6]. У 2011 годзе непадалёк ад святыні быў узведзены помнік Святым Пятру і Фяўроніі, што ў праваслаўнай традыцыі шануюцца як апекуны сям'і і шлюбу [7].



Малюнак 1. – Помнік Св. Пятру і Фяўроніі ля Успенскай царквы у а/г. Сар'я Верхнядзвінскага р-на. Фота з адкрытых інтэрнэт-крыніц



Малюнак 2. – Помнік ненароджанаму дзіцяці у г. Міёры. Фота з адкрытых Інтэрнэт-крыніц

Устаноўка помніка, паводле задумкі ініцыятараў, павінна была зрабіць яго папулярным аб'ектам сярод насельніцтва і садзейнічаць умацаванню сямейных каштоўнасцяў [8]. Як паказваюць матэрыялы анкетавання, на цяперашні момант з гэтым помнікам ужо звязваюцца пэўныя магічныя ўяўленні і дзеянні: *"Для таго, каб шлюб быў моцным, маладыя павінны разам трымацца за помнік"* (хлопец, 18 год, аграгарадок Сар'я Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл) [9]. Дадатковымі аб'ектамі у разглядаемым комплексе павінны былі стаць "Алея закаханых" і "Лава прымірэння", размешчаная на тэрыторыі храма [10].

Лагічным працягам працэсу стварэння знакавага культурна-ландшафтнага комплексу стала арганізацыя ў Сар'і штогадовага святкавання "Дня сям'і, любові і вернасці", які прымеркаваны да 8 ліпеня – дня памяці святых Пятра і Фяўроніі і праводзіцца з 2011 года. Свята адбываецца ў духу хрысціянскіх (праваслаўных) сямейных каштоўнасцей, пры гэтым заўважна імкненне арганізатараў надаць асобным яго дэталям сімвалічны сэнс у адпаведнасці з галоўнай ідэяй: *"Нават хросны ход у нас унікальны. У самым пачатку шэсце падзяляецца на два кольцы, якія сімвалізуюць мужчынскі і жаночы пачатак, а затым паломнікі аб'ядноўваюцца ў адзін агульны ход на дарожцы закаханых*" [7]. Увогуле праграма свята, як правіла, насычана мерапрыемствамі, што павінны садзейнічаць умацаванню сямейных каштоўнасцей: лекцыямі, публічнымі абмеркаваннямі пытанняў праблем шлюбу, сям'і і дэмаграфіі, выставамі, канцэртамі і да т.п. [11].

У якасці яшчэ аднаго прыкладу акцэнтавання ўвагі на пытаннях сям'і з дапамогай аб'ектаў культурнага ландшафту можна разглядаць Помнік ненароджанаму дзіцяці, што размяшчаецца ля Успенскага касцёла у г. Міёры. Помнік узведзены

[1] LAT – Living Apart Together – пара, што пражывае паасобку [2, с. 22].

PolotskSU



яшчэ ў 1997 годзе і сваім спецыфічным выглядам скіроўвае грамадскую думку да праблемы абортаў. Помнік мае выгляд стэлы, у верхняй частцы якой замацаваны нож гільятыны, а ўнізе размешчана стылізаваная фігурка дзіцяці ва ўлонні маці, якую абараняе ад нажа постаць Божай Маці са скрыжаванымі рукамі [12]. Звяртае на сябе ўвагу прасторавае вырашэнне помніка: ён размешчаны ля сцяны касцёла фактычна насупраць будынка радзільнага дома[1], што, як лічыцца, было зроблена адмыслова з ініцыятывы тагачаснага настаяцеля храма Уладаса Пятрайціса [13].

У 2014 годзе аналагічны мемарыяльны аб’ект быў адкрыты на тэрыторыі Касцёла Беззаганнага зачацця Дзевы Марыі ў в. Удзела Глыбоцкага раёна. Помнік быў створаны, дзякуючы ініцыятыве парафіян, духавенства і пры падтрымцы мясцовых улад. У кампазіцыю мемарыяла ўваходзяць крыж, камень з таблічкай “Памяці ненароджаных дзяцей” і скульптурная выява Божай Маці, што трымае ў руках знявечаныя целы немаўлят, што так і не з’явіліся на свет [14]. Відавочна, што мастацкае вырашэнне помніка, як і ў Міёрах, разлічана на досыць моцнае псіхалагічнае ўздзеянне з мэтай завастрэння ўвагі на праблеме абортаў.




**Малюнак 3. – Помнік ненароджаным дзецям у в. Удзела Глыбоцкага р-на. Фота аўтара**

Трансфармацыя сістэмы сямейных каштоўнасцей паўплывала і на стан традыцыйнай сямейнай абраднасці, у прыватнасці, вясельнай. Заўважнай тэндэнцыяй апошніх гадоў з’яўляецца не толькі змяншэнне колькасці зарэгістраваных шлюбаў [3, с. 23], але і скарачэнне, спрашчэнне самога вясельнага абраду ў яго традыцыйных формах, а часам і ўвогуле адмова ад яго. Разам з тым, характэрнай рысай сучаснага вяселля (калі яно ўсё ж-такі праводзіцца) з’яўляецца ўзбагачэнне яго за кошт перайманне ўзораў заходняй масавай культуры, што стала магчымым пасля адкрыцця “жалезнай заслоны” напрыканцы XX ст., і асабліва заўважна зараз у сувязі з развіццём сферы паслуг і фактычна неабмежаванымі магчымасцямі пошуку інфармацыі ў Інтэрнэце. Адной з праяваў такога працэсу стаў у апошнія дзесяцігоддзі феномен так званых “замкоў кахання”.

Лічыцца, што звычай вешаць вясельны замок мае італьянскія карані і стаў папулярны з пачатку 1990-х гг. дзякуючы творам мастацкай літаратуры [15]. Гэта адзін з самых устойлівых і пашыраных элементаў сучаснага гарадскога вяселля, у тым ліку і на Віцебшчыне. На замкі, як правіла, наносяцца імёны жаніха і нявесты, разнастайныя вясельныя сімвалы і да т.п. Сімволіка гэтых дзеянняў прачытваецца ў сучаснасці досыць адназначна: *«гэта як традыцыя, як вера ў тое, што, замыкаючы замок, каханне маладых будзе да канца іх дзён»* (дзяўчына, 17 год, г. Навалукомль); *«каб быў моцны шлюб»* (хлопец, 18 год, г. Полацк)», *«для захавання шчаснага і доўгага шлюбу»* (дзяўчына, 18 год, г. Наваполацк)” [9].

Найбольш распаўсюджаным месцам, куды маладыя вешалі замок, першапачаткова былі парэнчы мастоў. Як правіла, ў канкрэтным горадзе дзеля гэтага абіраюцца невялікія, найбольш зручныя для доступу масты (Пушкінскі мост у Віцебску, Чырвоны мост у Полацку і да т.п). У гарадах, дзе падыходзячыя масты адсутнічаюць, месцам вывешвання замкоў могуць стаць іншыя канструкцыі, напрыклад, у г. Міёры такім мэтам служыць агароджа набярэжнай возера [16, с. 540].

Відавочна, што месца вешання замка прывязваецца да воднага аб’екта з тым, каб потым выкінуць у ваду ключы, што, зноў-такі, павінна ўвасабляць непарушнасць заключанага шлюбу: *«Маладыя кідаюць ключыкі ад замка ў ваду… [Гэта] вера ва ўмацаванне будучай сям’і»* (дзяўчына, 17 год, г. Новалукомль); *«Вешаюць замкі, а ключы выкідваюць у раку. [Гэта] сімвал моцнага і доўгага сумеснага жыцця»* (хлопец, 19 год, г. Полацк) [9].

Мост у суседстве з вадой у дадзеным выпадку валодае дастаткова традыцыйнай лімінальнай сімволікай, на што звярталі ўвагу даследчыкі яшчэ ў XIX ст [17]. Яна прасочваецца і ў іншых абрадавых дзеяннях, што лакалізуюцца тут жа. Напрыклад з мостам звязаны яшчэ і звычай развітання нявесты з дзявочым прозвішчам, што таксама мае пэўнае пашырэнне ў беларускіх гарадах: *«[кладзецца] запіска ў пустую бутэльку і кідаецца ў вадаём; напісаць [прозвішча] на [паветраных] шарах і выпусціць іх»* (дзяўчына, 18 год, г. Наваполацк); *«нявеста запускае ўверх шарыкі, дзе на кожны шарык прымацавана літара яе* прозвішча» (хлопец, 19 год, г. Шуміліна)»; «нявеста на паветраных шарах адпускае сваё прозвішча ў нябёсы» (дзяўчына, 18 год, г. Міёры). Акрамя таго, ад жаніха часта патрабуецца перанесці нявесту праз мост на руках,

[1] Радзільны дом размяшчаўся ў дадзеным будынку да 2018 г.

PolotskSU



што, па меркаванню рэспандэнтаў, азначае *«пераход з аднаго перыяду жыцця ў другі»* (хлопец, 18 год, г. Наваполацк); *«сімвалічны пераход ад аднаго сацыяльнага статусу ў іншы»* (хлопец, 17 год, г.п. Ліёзна) [9].



**Малюнак 4. – Замкі на Пушкінскім мосце ў Віцебску. Фота аўтара**



**Малюнак 5. – Замкі на набярэжнай возера у г. Міёры. Фота аўтара**

З цягам часу вешанне "замкоў кахання" стала настолькі масавым, што гэта пачало ствараць праблемы ў справе догляду і абслугоўвання мастоў. Перыядычна ажыццяўляліся спробы спілоўвання замкоў, аднак яны не мелі патрэбнага эфекту, так як замкі неўзабаве з'яўляліся зноў, да таго ж, гэта выклікала негатыўную рэакцыю гараджан. Своеасаблівым спосабам прыстасавання гарадскога асяроддзя да сітуацыі стала стварэнне адмысловых архітэктурных (скульптурных) форм і іншых элементаў гарадскога ландшафту, што спецыяльна прызначаліся для размяшчэння вясельных замкоў . Так, каля аддзелаў ЗАГС, у парках, ля мастоў з'явіліся альтанкі, лаўкі, стылізаваныя «дрэвы шчасця» (напрыклад, «Дрэва кахання» ў гарадскім парку г. Наваполацка, стылізаваныя кампазіцыі і малыя архітэктурныя формы са шлюбнай сімволікай ля аддзелаў ЗАГС у Міёрах і Полацку і да т.п.) [16, с. 540].



**Малюнак 6. – "Дрэва кахання" ў г. Наваполацку. Фота аўтара**

PolotskSU





**Малюнак 7. – Лаўка каля аддзелу ЗАГС у г. Полацку. Фота аўтара**



**Малюнак 8. – Кампазіцыя на набярэжнай у г. Міёры. Фота аўтара**

Акрамя таго, у некаторых гарадах былі створаны цэлыя ландшафтныя комплексы (алеі, паркі), звязаныя з вясельнай тэматыкай. Напрыклад, у г. Глыбокае у 2014 годзе быў адчынены "Сквер маладых", дзе размясцілі "Падкову шчасця, Лаву прымірэння, Кашалёк дабрабыту, каваныя вароты, вясельныя арэлі, сэрца з анёлам, дэкаратыўныя каваныя дрэвы" [18].





**Малюнкі 9-10. – Элементы кампазіцыі "Скверу маладых", г. Глыбокае. Фота аўтара**

У выніку паўстаў цікавы элемент гарадскога культурнага ландшафту, дзе праводзяцца нават выязныя рэгістрацыі шлюбу, а элементы дэкору стымулююць з'яўленне новых вясельных звычаяў, напрыклад: "*Кашалёк дабрабыту – гэта своеасаблівы знак матэрыяльнага дабрабыту, таму той, хто хоча жыць багата, павінен дакрануцца да кашалька і загадаць гэтае жаданне"* [18]. Лагічным працягам развіцця сямейна-шлюбнай тэматыкі стала ўсталяванне непадалёк ад "Сквера маладых" ў 2016 г. скульптурнай выявы сям'і.



**Малюнак 11. – Скульптурная кампазіцыя "Сям'я" у г. Глыбокае. Фота аўтара.**

PolotskSU



***Заключэнне.*** Такім чынам, вышэйпрыведзеныя прыклады дэманструюць спробы выкарыстання патэнцыялу аб'ектаў культурнага ландшафту ў працэсе рэактуалізацыі сямейных каштоўнасцяў на фоне ўласцівага сучаснаму грамадству крызісу традыцыйных інстытутаў сям'і і шлюбу. Відавочна, што заўважная ініцыятыва ў гэтым працэсе належыць каталіцкай і праваслаўнай цэрквам, якія завастраюць увагу ў першую чаргу на праблемах дзетанараджэння і захавання традыцыйных сямейных роляў.

Аб'екты кшталту "дрэў каханя" для вешання вясельных замкоў з'явіліся ў культурным ландшафце гарадоў, у першую чаргу, як рэакцыя на адмысловую "моду", а таксама з меркаваннеў практычнага характару, аднак, іх таксама можна разглядаць як сродак папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў, у прыватнасці, ўяўленняў аб моцным шлюбе, трываласці сямейных адносін, пераемнасці традыцый і да т.п.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Беларусь: Структура семьи, семейные отношения, репродуктивное поведение : Том I. Методология и опыт проведения исследования «Поколения и гендер» / ред.: Д.Г. Ротман, Том Эмери. – Минск: Белсэнс, 2018. – 162 с.
2. Беларусь: Структура семьи, семейные отношения, репродуктивное поведение : Том II. Анализ результатов исследования «Поколения и гендер» / ред.: О. Терещенко; Т. Кучера – Минск: Белсэнс, 2018. – 189 с.
3. Демографический ежегодник Республики Беларусь: статистический сборник [электронный ресурс]. // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2019. – 429 с. // Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/145/145cac172f7bf1a9801c64e20888661f.pdf. – Дата доступа: 10.02.2021.
4. Приложение 1 к государственной Программе "Здоровье народа и демографическая безопасность Республики Беларусь на 2016-2020 годы: Мероприятия подпрограммы 1 "Семья и детство" [электронный ресурс]. // Режим доступа: http://www.government.by/upload/docs/file93e5afe3bb6a2910.PDF. – Дата доступа: 21.12.2020.
5. Русецкі, А.У. Мастацкая культура Віцебскага Паазер'я // А.У. Русецкі, Ю.А. Русецкі. – Мн.: БелЭН, 2005. – 320 с.
6. Саулич В. История и современность агрогородка Сарья Верхнедвинского района [Электронный ресурс]. / В. Саулич // Беларусь сегодня - Режим доступа: https://www.sb.by/articles/u-sar-yu-i-rositsu-zno-prylyatseli-busly.html. – Дата доступа: 21.12.2020.
7. День семьи, любви и верности соберет паломников в Сарье Верхнедвинского района [электронный ресурс]. // Режим доступа: https://www.belarus.by/ru/press-center/press-release/den-semji-ljubvi-i-vernosti-soberet-palomnikov-v-sarje-verxnedvinskogo-rajona_i_60247.html – Дата доступа: 21.12.2020.
8. Партолина, Н. В Сарье поставили первый в Беларуси памятник Петру и Февронии [электронный ресурс] / Н. Партолина. // Комсомольская правда. - Режим доступа: https://www.kp.by/online/news/929096/. – Дата доступа 21.12.2020.
9. Матэрыялы анкетавання (праведзена аўтарам у траўні-верасні 2019 г. сярод студэнтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта).
10. Чайкина Ж. Сарьянский Тадж-Махал [электронный ресурс] / Ж. Чайкина // Режим доступа: http://www.grani.lv/world/45500-saryanskiy-tadzh-mahal.html. – Дата доступа: 21.12.2020.
11. В Сарье пройдёт день семьи, любви и верности [электронный ресурс] // Дзвінская праўда. – 28.06.2019. – Режим доступа: http://www.d-p.by/2019/06/v-sare-projdyot-den-semi-lyubvi-i-vernosti/. – Дата доступа: 21.12.2020.
12. Велосипедный маршрут «Золотое кольцо Миор» [электронный ресурс] // BellaDvina: Белорусско-латвиский туристический портал. - Режим доступа: http://belladvina.com/files/102-106-13.miorschina_ru.pdf. – Дата доступа: 25.02.2021.
13. Матвеева Т. Набережная в 500 метров, птичий «аэропорт», колонна свободы. Пять причин побывать в Миорах [электронный ресурс]. // Т. Матвеева. – Режим доступа: https://news.tut.by/society/509250.html. – Дата доступа: 21.12.2020.
14. Памятник нерожденным детям установили в Глубокском районе [электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/society/427283.html. – Дата доступа: 21.12.2020.
15. Залесская, А. Откуда появилась традиция вешать замок любви и что она означает [электронный ресурс] / А. Залесская // Домашний очаг. – Режим доступа: https://www.goodhouse.ru/family_and_children/psihologiya/otkuda-poyavilas-tradicziya-veshat-zamok-lyubvi-i-chto-ona-oznachaet/. – Дата доступа: 10.09.2020.
16. Мішына, В.І. Вясельны абрад у культурным ландшафце сучаснага горада: да феномену "замкоў кахання" (па матэрыялах Віцебшчыны) / В.І. Мішына // Традыцы і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. Вып. 2 / гал. рэд. А.І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2021. – с. 539-541.
17. Потебня, А.А. Переправа через воду как представление брака / А.А. Потебня // Слово и миф. – Москва : Правда, 1989. – С. 553-565.
18. В ажуре кованых изделий [электронный ресурс] // Режим доступа: http://vajure.by/novosti/94-vajure-kovanyh-izdelij. – Дата доступа: 21.12.2020.


## OBJECTS OF THE CULTURAL LANDSCAPE AS A TOOL POPULARIZATION OF TRADITIONAL FAMILY VALUES IN MODERN BELARUSIAN SOCIETY (BASED ON MATERIALS FROM VITEBSK REGION)

V. MISHYNA

*The article analyzes the objects of the cultural landscape as a means of popularizing family values in the context of the crisis phenomena characteristic of the institutions of family and marriage at the present stage. On the example of the use of architectural and sculptural forms and landscape complexes, illustrated ways of re-actualizing family values in modern society.*

***Key words:*** *cultural landscape, traditional family values, family, marriage, wedding ceremony.*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 1/8. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.